**Список источников и литературы**

1. Кошевар, Д. В. Юные герои Великой Отечественной войны. Николай Гойшик [Электронный ресурс] / Д. В. Кошевар // ВикиЧтение. – Режим доступа: https://military.wikireading.ru/hdu52pUmz7. – Дата доступа: 18.04.2023.

2. Гойшик Николай Васильевич [Электронный ресурс] // Витебская областная библиотека им. В. И. Ленина. Отдел детской и юношеской литературы. – Режим доступа: http://deti.vlib.by/index.php/yunye-geroi-vojny/183-yunye-geroi/2526-gojshik-nikolaj-vasilevich. – Дата доступа: 18.04.2023.

3. Кузьмич, М. Героическая семья Гойшик [Электронный ресурс] / М. Кузьмич // SB.BY. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/geroicheskaya-semya-goyshik.html. – Дата доступа: 18.04.2023.

**В. А. Дзмітрук**
г. Брэст, Політэхнічны каледж

Навуковы кіраўнік: **І. В. Карніловіч**, метадыст філіяла УА БрДТУ «Політэхнічны каледж»

## ГІСТОРЫЯ МАЁЙ СЯМ'І, ГІСТОРЫЯ МАЙГО РОДУ. АРСЕНІЙ ІВАНАВІЧ ДЗМІТРУК

*Не страшна жыць*
*Я – дрэва з каранямі:*
*Радзіму маю, продкаў і сям'ю.*
*Цаню ўсё, бо вельмі добра знаю*
*Сама ў чыйсьці корань я пайду.*

Кожны з нас павінен ведаць свае карані, сваіх продкаў, гісторыю свайго роду, таму што сям'я адыгрывае вялікую ролю ў станаўленні чалавека як асобы.

Сёння вывучэнне сваёй сям'і стала асабліва актуальным. Сучасныя сем'і вельмі мала маюць зносін не толькі з далёкімі, але і з блізкімі сваякамі. Губляецца сувязь пакаленняў. Некаторыя маладыя людзі нічога не ведаюць нават пра сваіх прабабуль і прадзедаў. Але ў нашай сям'і шануюць памяць продкаў, шануюць сямейныя традыцыі і рэліквіі, таму што памяць пра продкаў – права на заўтра для сучаснікаў.

Менавіта мае бацькі, бабуля і дзядуля, родныя параілі мне пачаць даследаванне гісторыі нашага роду. Я захапілася гэтым даследаваннем і цяпер мне самой цікава даведацца ўсё пра маіх сваякоў. Я лічу, што жыццё адной сям'і, гісторыя роду з'яўляюцца адлюстраваннем вялікай гісторыі краіны, дапамагае ўявіць жывую гісторыю мінулых гадоў. Захаванне памяці пра сваіх продкаў фарміруе паважлівае стаўленне да сваіх каранёў, сваёй сям'і, роду.

Мэта даследчай работы: сабраць звесткі пра жыццё майго прадзеда па бацькавай лініі Арсенія Іванавіча Дзмітрука, што ў далейшым паслужыць матэрыялам да напісання летапісу майго роду.

Зыходзячы з мэты, былі пастаўлены наступныя задачы:

– сабраць інфармацыю шляхам інтэрв’ю і асабістых размоў са сваякамі пра жыццё Арсенія Іванавіча Дзмітрука;

– сабраць і сістэматызаваць сямейныя фотаздымкі;

– знайсці артыкулы пра Арсенія Іванавіча Дзмітрука, якія былі размешчаны ў сродках масавай інфармацыі;

– фарміраваць патрэбнасць захоўваць сямейныя рэліквіі і традыцыі.

Аб’ектам даследавання з’яўляюцца звесткі пра жыццё майго прадзеда Арсенія Іванавіча Дзмітрука.

Метады даследавання агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, навуковасці, аб’ектыўнасці і інш.) і спецыяльна гістарычныя (храналагічны, інтэрв’ю і інш.) – праводзіліся інтэрв’ю і асабістыя размовы са сваякамі, работа з газетнымі артыкуламі, сістэматызацыя фотаздымкаў, верыфікацыя арыманых дадзеных з архіўнымі дакументамі і афіцыйнай гісторыяй Беларусі. Пад час напісання даследчай працы асноўнай крыніцай інфармацыі пра жыццё Арсенія Іванавіча Дзмітрука – майго прадеда па бацькавай лініі, былі мой дзед Дзмітрук Васілій Арсенцьевіч, яго родны брат Дзмітрук Міхаіл Арсенцьевіч і яго сястра Дзмітрук Таццяна Арсенцьеўна.

Матэрыялам для работы паслужылі: фотаздымкі; запісы асабістых размоў са сваякамі; артыкул «Дзмітруковаму роду няма пераводу», размешчаны ў газеце «Драгічынскі веснік» 15 сакавіка 2008 года; рэпартаж.

Гэтая гісторыя бярэ свой пачатак больш за 100 гадоў таму. Беларуская вёсачка Радастава размяшчалася сярод лесу і балот, зараз гэта аграгарадок у Драгічынскім раёне (фота 1). На краі вёскі стаяла невялікая хатка, дзе жыла сям’я Дзмітрукоў. Сям’я была працавітая, сціплая, усе займаліся гаспадаркай: сеялі, аралі, касілі. Вясной 5 сакавіка ў іх нарадзіўся сынок – яго назвалі Арсеніем.




**Фота 1** – Радастава – аграгарадок ў Драгічынскім раёне Брэсцкай вобласці

Арсеній падрастаў, набіраўся сіл. Дапамагаў бацькам па гаспадарцы, кожную вясну ён з бацькам араў зямлю, насіў сена для жывёлы. Увосень капалі бульбу, хадзілі ў лес па ягады і грыбы. Трэба было назапасіцца прадуктамі на цэлы год. Зімой вазілі сена з балота і нарыхтоўвалі дровы. За працай гады праляцелі.

Заходняя Беларусь згодна з Рыжскім дагаворам стала часткай маладой Польскай дзяржавы. Многія беларусы ў той час служылі ў Войску Польскім. Калі Арсенію споўнілася 20 гадоў – яго прызвалі ў армію, дзе ён служыў кавалерыстам. Пасля службы ў войску вярнуўся ў родную хату.

Арсеній зноў стаў дапамагаць бацькам па гаспадарцы. З бацькам яны сталярнічалі, рабілі вокны, дзверы, будавалі дамы, займаліся пчалярствам. У хлопца з самаго дзяцінства была мара: зарабіць грошай, пабудаваць свой дом і абзавесціся сям'ёй.

Пазней ён сустрэў Антаніну і пакахаў яе, яны сыгралі вяселле, пачалі будавать сваю хату. У 1940 годзе нарадзіўся ў іх сын Міхаіл. У гэтым годзе Арсенія адправілі ў мястэчка каля Пінска, дзе ён разам з іншымі будаўнікамі павінен быў аберагать і аднаўляць шлюзы. Шлюзы былі драўляныя і трэба было бярвёны замяняць на новыя, усю працу яны рабілі ўручную.

Прыйшла нядобрая вестка – пачалася вайна. Арсеній Іванавіч разам з іншымі будаўнікамі па чарзе дзяжурылі і днём і ноччу, аберагаючы шлюзы. Немцы наступалі ўсё бліжэй і бліжэй. Аднойчы немцы вельмі моцна пачалі бамбіць мост. Брыгадзір загадаў усім бегчы на іншы бок маста (фота 2). Многім не ўдалося перайсці мост, а Арсенію Іванавічу і яшчэ двум яго таварышам пашчасціла, і яны засталіся жывыя. Немцы поўнасцю знішчылі мост і шлюзы. Арсеній Іванавіч з таварышамі вяртаўся ў родную вёску. Яны ішлі днём і ноччу, калі прыйшлі ў вёску, то ўбачылі, што некаторыя дамы былі спалены. Маці Арсенія Іванавіча, яго бацьку, брата з яго дзецьмі немцы расстралялі. Але мой прадзед застаўся ў вёсцы і разам з іншымі сялянамі стаў аднаўляць яе з папялішча.



**Фота 2** – Мост праз раку Піну каля Пінска, пачатак 1940-х гадоў

Вайна пакінула ў сэрцы майго прадзеда вялікую рану.

Пасля вайны Арсеній Іванавіч разам з жонкай Антанінай будавалі дом, сеялі, аралі, нараджалі дзяцей. Але і тут лёс прынёс суровае выпрабаванне: іх дачка Зіначка ў трохгадовым узросце захварэла і памерла. Не змаглі вылечыць, бо не было лекаў.

Арсеній Іванавіч з жонкай выгадавалі семярых дзяцей. Апошняе дзіця, сын Валодзя, нарадзілася, калі Арсенію Іванавічу споўнілася 56 гадоў. Ён шмат увагі надаваў сваім дзецям.

Мой дзядуля Васілій Арсенцьевіч расказваў, што калі ён рос, то быў вельмі шустрым дзіцём. Калі яму споўнілася 7 гадоў, ён упаў і пашкодзіў нагу – зламаў каленны сустаў. Шмат давялося Арсенію Іванавічу павазіцца, каб паставіць яго на ногі, але праз некаторы час Вася з сябрамі катаўся на лёдзе і зноў упаў на тую ж нагу. Нага зажыла, але часам вельмі моцна балела, а праз некаторы час увогуле пачала чырванець. Яго адвезлі ў бальніцу у горад Брэст.

У Брэсце мой дзядуля тыдзень ляжаў у бальніцы, а калі прыехаў яго бацька, то ўрач сказаў, што нагу трэба ампуціраваць. Арсеній Іванавіч тады ўзяў на сябе адказнасць за сына і павёз яго ў Маскву, бо ен ведаў, што там сыну дапамогуць. І вось мой дзед ў свае восем гадоў паехаў у Маскву. Пасля абследвання яго накіравалі ў Валгаградскую вобласць у горад Наванінск, дзе паклалі ў бальніцу. Там ён ляжаў цэлы год і пасля зноў пачаў хадзіць, атрымаў групу па інваліднасці. Мой дзядуля стаў кульгаць, але лепш кульгаць, чым жыць без нагі.



**Фота 3** – Арсеній Іванавіч Дмітрук (100 гадоў)

Мой прадзед Арсеній Іванавіч адпрацаваў у калгасе 50 гадоў, займаўся коньмі. Ён не меў адукацыі, быў малаграматны, але даў дзецям усё для іх шчаслівага жыцця. Усе дзеці з сям’і Дзмітрукоў атрымалі вышэйшую адукацыю і раз’ехаліся па свеце. У 1991 годзе памерла жонка. Сэнсам жыцця Арсенія Іванавіча сталі яго дзеці.

У 2008 годзе Арсенію Іванавічу Дзмітруку споўнілася 100 гадоў (фота 3).

Да гэтай падзеі больш рыхтаваліся яго дзеці, чым сам прадзед: яны і шпалеры ў бацькавай хаце пераклеілі, і фарбай паднавілі бляск у пакоях, і прысмакі розныя прыгатавалі…



**Фота 4** – 100-гадовы юбілей А. І. Дзмітрука, 2008.

5 сакавіка сядзіба напоўнілася радасным людскім разнагалоссем: сюды прыйшлі і прыехалі шасцёра дзяцей Арсенія Іванавіча (за выключэннем дачкі Таццяны, якая жыве ў Растове). Шматлікія ўнукі і праўнукі таксама сабраліся ў доме адзначыць юбілей (фота 4). Павіншаваць доўгажыхара прыехалі прадстаўнікі раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання і старшыня калгаса, дзе Арсеній Івановіч працаваў усё жыццё. Праз тры тыдні пасля святкавання прадзед памёр.

Кожны чалавек павінен ведаць сваіх продкаў, цікавіцца: кім яны былі, чым займаліся, кім працавалі, якія ў іх былі інтарэсы, традыцыі, сямейныя каштоўнасці? У далейшым нашы дзеці і ўнукі будуць цікавіцца сваёй радаслоўнай. Бо мы нарадзіліся на свет дзякуючы людзям старэйшых пакаленняў. Трэба захоўваць памяць пра нашых блізкіх, а таксама пакідаць памяць пра сваё жыццё нашым дзецям і ўнукам.

Практычная каштоўнасць даследчай працы заключаецца ў тым, што я стану захавальнікам гісторыі свайго роду, а ў будучыні і сваім дзецям змагу расказаць пра нашых продкаў.